***А. І. Смолік***
*(Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў)*

# НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСАЎ (ДА ПАСТАНОЎКІ ПРАБЛЕМЫ)

Даследаваннем розных аспектаў культуры ў XXI стагоддзі займаецца вялікая колькасць сацыягуманітарных навук. Узаемадзеянне і ўзаемаўплыў гэтых навуковых дысцыплін, якія займаюцца вывучэннем пэўных аспектаў культуры, дае падставы меркаваць аб тым, што ў Беларусі адбываецца фарміраванне новай якаснай тэорыі культуры. Айчынная культуралогія сёння мае ўласныя метадалагічныя прынцыпы і метадычныя ўстаноўкі, якія дазваляюць вывесці навуку аб культуры на ўзровень, які адпавядае сучасным патрабаванням і дазваляе забяспечыць практычную рэалізацыю новых праблем. Беларуская культуралогія сфарміравала «мову» навукі аб культуры, што сведчыць аб яе дысцыплінарнай самастойнасці. «Мова» культуралогіі – гэта сістэма паняццяў, тэрмінаў, якімі яна карыстаецца. «Мова» культуралогіі, як і ўсіх іншых навук, з'яўляецца цэласнай і адначасова рухомай, дынамічнай. У ёй з цягам часу ўзнікаюць новыя паняцці, якія не толькі колькасна змяняюць «слоўнік» навукі, але і якасна трансфармуюць усю паняційную сістэму. Так, зусім нядаўна ў «мову» айчыннай культуралогіі ўвайшло паняцце «нематэрыяльная культурная спадчына». Яно (у заходніх краінах дадзенае паняцце атрымала найбольшае распаўсюджанне як Oral heritage of humanit) ў пачатку бягучага стагоддзя стала прадметам абмеркавання на розных міжнародных навуковых форумах: XIX Генеральнай канферэнцыі ІКОМ у Барселоне (2001 г.), канферэнцыі СІДОК у Порта-Алегра (2003 г.), XX Генеральнай канферэнцыі ІКОМ у Сеуле (2004 г.) і інш. У 2003 г. ЮНЕСКА прыняла «Міжнародную канвенцыю аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны». З гэтай нагоды нематэрыяльная спадчына ўвайшла сёння ў фокус даследчыцкай цікавасці як тэарэтыкаў, так і практыкаў.

Аб'ектам асаблівай увагі грамадства ў шэрагу краін Еўропы і ЗША культурная спадчына стала толькі з сярэдзіны XIX ст., калі ў Нарвегіі ў 1844 г. была заснавана першая ў свеце нацыянальная грамадская арганізацыя па захаванні спадчыны. Быў пакладзены пачатак так званаму траставаму (даверальнаму) падыходу да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аховы і выкарыстання культурнай спадчыны [92]. Па прыкладзе Нарвегіі былі створаны вядучыя амерыканскія і брытанскія трасты, а ўслед за імі і трасты ў астатніх развітых краінах свету, што спрыяла развіццю і далейшай папулярызацыі паняцця культурнай спадчыны. Разам з тым узнікла неабходнасць у распрацоўцы тэорыі захавання культурных каштоўнасцей, што выявіла адсутнасць адпаведных навуковых ідэй і, як вынік, пэўнай лексікалагічнай асновы фарміравання новых паняццяў.

Першыя спробы самастойнага асэнсавання неабходнасці аховы культурнай спадчыны ў агульнасусветным маштабе ажыццявіў вядомы рускі дзеяч культуры М. К. Рэрых. Ён адным з першых у сваіх артыкулах навукова абгрунтаваў неабходнасць стварэння адзінай сістэмы аховы культурных каштоўнасцей. Менавіта тэарэтычныя распрацоўкі М. К. Рэрыха паспрыялі фарміраванню агульнасусветнай ідэі захавання культурнай спадчыны, на якой заснавана зараз дзейнасць ЮНЭСКА ў адзначанай галіне. Заклікаючы да аховы гістарычных помнікаў, М. К. Рэрых кіраваўся тым, што без мінулага немагчыма будучыня. Філосаф разумеў, што толькі звяртаючыся да назапашанага вопыту, чалавецтва зможа ствараць новыя культурныя формы, пошук якіх захавае культурную пераемнасць і паслужыць сродкам далейшага развіцця.

Асабліва актыўна ў гэтым кірунку працуюць музеязнаўцы. У якасці прыклада можна прывесці працы М. Я. Каўлена [3], С. Кананович [2] і інш. У навуковай літаратуры няма адназначнага падыходу да вызначэння сутнасці дадзенага паняцця. Так, расійскі культуролаг А. Я. Фліер разумее пад нематэрыяльнай культурнай дзейнасцю чалавека «ўстойлівыя сацыяльныя групы людзей, спецыфічныя сваімі своеасаблівымі культурнымі рысамі» [6]. Недастаткова выразныя крытэрыі ў аснову класіфікацыі аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны бярэ М. Я. Каўлен. Пры падзеле гэтай з'явы культуры на тыпы ён у адзін тып уключае цалкам або часткова элементы іншага тыпу.

У навуковай літаратуры таксама існуе пункт гледжання, згодна з якім нематэрыяльная спадчына асэнсоўваецца па аналогіі са спадчынай матэрыяльнай. Такі падыход найбольш выразна праяўляецца пры класіфікацыі і вызначэнні этапаў захавання і прэзентацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Недахоп дадзенага падыходу відавочны. Калі браць за аснову дэфініцыю «нематэрыяльны», то яна прадугледжвае перш за ўсё адсутнасць матэрыяльнай (прадметнай) асновы, іншымі словамі, адсутнасць пэўнай фізічнай формы. Калі ж разглядаць усё азначэнне «нематэрыяльная спадчына», то магчыма дапусціць, што размова ідзе пра ўсе аб'екты культуры, якія не выражаны ў апрадмечанай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(рэчыўнай) форме – аб духоўнай культуры наогул. І сам падзел культуры на матэрыяльную і духоўную таксама ўмоўны. Сустракаюцца меркаванні, паводле якіх нематэрыяльную спадчыну атаясамліваюць з традыцыйнай культурай. Пры гэтым, праводзячы мяжу паміж пісьмовай культурай сучасных урбанізаваных грамадстваў і культурай вуснага тыпу (традыцыйнай, фальклорнай), культуролагі, сацыёлагі і мастацтвазнаўцы зазначаюць, што «традыцыйныя відовішчныя формы працягваюць заставацца найменш вывучанымі» ў параўнанні з тэхнічнымі і тэхнагеннымі відовішчамі (кінематограф, тэлебачанне) і відовішчнымі формамі мастацтва (цырк, тэатр, эстрада) [5, с. 5]. Сярод такіх традыцыйных форм аднымі з першых называюць фальклорныя рытуалы, народныя святы, масавыя гулянні – з'явы, якія сёння бяруць пад ахову. Аналіз традыцыйнай культуры нярэдка замяняецца вывучэннем нематэрыяльнай спадчыны, а асацыяцыя першага з другім прыводзіць да таго, што нетрадыцыйная спадчына часткова асэнсоўваецца як нешта, складовай часткай чаго можа з'яўляцца нематэрыяльная спадчына.

Шэраг навукоўцаў лічыць, што вызначэнне паняцця «нематэрыяльная культурная спадчына», дадзенае ў «Міжнароднай канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны», найбольш адпавядае сутнасці і зместу разглядаемай дэфініцыі. Паводле Канвенцыі нематэрыяльная культурная спадчына азначае «звычаі, формы ўяўлення і выражэння, веды і ўменні, – а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы, прызнаныя суполкамі людзей, а ў некаторых выпадках асобнымі людзьмі, у якасці іх культурнай спадчыны». На наш погляд, дадзенае вызначэнне надзвычай шырокае і патрабуе канкрэтызацыі і паглыблення.

Для разумення зместу аналізуемага паняцця прынцыповае значэнне мае тое, што нематэрыяльная культурная сфера культуры не з'яўляецца аднароднай, перш за ўсё па *форме* свайго існавання, таму неабходна размяжоўваць дзве ўзаемазвязаныя, але розныя па прыродзе з'явы. Па-першае, маецца на ўвазе, што ёсць аб'екты культуры, якія існуюць пераважна ў форме часавай рэпрэзентацыі (музыка, танец, тэатр, фальклор і інш.). Па-другое, ёсць уласна нематэрыяльная кампанента культуры, якая разглядаецца як «код» пэўнай культуры ці сегмента культуры. Падзел формы рэпрэзентацыі ў культуры на прасторавую і часавую, вядома, умоўны. Аднак, такая дыферэнцыяцыя мае сэнс, бо з'явы культуры адрозніваюцца па дамінуючым прынцыпе арганізацыі камунікатыўнага працэсу. Так, прасторавыя (матэрыяльныя) з'явы валодаюць пэўнай ступенню ўстойлівасці і нязменнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Часавыя (нематэрыяльныя) з'явы характарызуюцца працэсуальнасцю і зменлівасцю. Да матэрыяльных аб'ектаў мы адносім прадметы, створаныя і апрацаваныя людзьмі, штучна пераўтвораныя тэрыторыі, зафіксаваныя тым або іншым чынам «культурныя тэксты», хатнія аб'екты гаспадарання. Да ідэальных – веды, уяўленні, сэнсы, прынцыпы, ідэі, міфы і г. д. Нягледзячы на тое, што вызначыць мяжу, якая падзяляе аб'екты культуры на матэрыяльныя і ідэальныя, дастаткова складана, менавіта аб'екты спадчыны вуснай традыцыі, па нашым меркаванні, складаюць сутнасць нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Асабліва важнае значэнне гэта мае ў музейнай практыцы, паколькі традыцыйныя музейныя прадметы, незалежна ад таго кантэксту, у якім яны змешчаны ў рамках экспазіцыі, не змяняюцца пад уплывам часу. Агульная ж якасць усіх катэгорый нематэрыяльных форм культуры – іх зменлівасць, прыкладам чаго могуць быць традыцыйныя народныя абрады. У якасці прыклада можна прывесці старажытны і «жывы» дагэтуль вясельны абрад, які рэвіталізавалі і рэпрэзентуюць супрацоўнікі Мотальскага музея народнай творчасці напярэдадні Вадохрышча. Менавіта ў гэты час у Беларусі спраўлялі вяселлі.

Вяселле пачыналі зборнай суботай, калі ў хаце жаніха і нявесты збіраліся сваякі і суседкі пячы каравай. Маладыя ў гэты час не павінны былі заходзіць у хату.

Вось як ладзіўся абрад у хаце жаніха. Сярод каравайніц розных узростаў была адна маладуха, якая нядаўна ўзяла шлюб, – для пераемнасці традыцый, сакрэтаў выпякання каравая. Нікому з мужчын, акрамя аднаго-двух самых блізкіх сваякоў, не дазвалялася заходзіць у хату. Увесь працэс выпечкі каравая суправаджаўся песнямі. Пасля расчынення караваю ўсе каравайніцы мылі рукі ў адной місе, ваду з якой вылівалі пад урадлівую вішаньку. Пакуль цеста падыходзіла, каравайніцы выраблялі «шышкі». Шышка – гэта разгалінаваны сучок пладовага дрэва вышынёй каля 1 метра, які абвівалі палоскай цеста і падпякалі перад полымем, яго ўпрыгожвалі барвінкам, бяссмертнікам, штучнымі кветкамі, жытам, спелым і зялёным аўсом.

На караваі жаніха было зроблена пяць шышак: дзве трайчаткі – галінкі з трыма адгалінаваннямі, а таксама тры двайчаткі – галінкі з двума адгалінаваннямі (у маладой – дзве двайчаткі і тры трайчаткі). Цікава, што лічба пяць паўтараецца ўсюды ў каравайным абрадзе: пяць каравайніц, пяць шышак, пяць галіначак у суме на шышках, якімі абменьваюцца маладыя падчас вяселля. Шышкі замацоўваюцца на галінках чырвонымі ніткамі – знакам роднасці па крыві. Лічба пяць з'яўляецца ў Моталі родавым знакам, бо на Каляды тут здзяйсняюць традыцыйныя абрады з 5-прамянёвай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зоркай. Падчас вяселля маладыя абменьваюцца шышкамі ў знак вернасці (гэты даўні звычай заменены зараз на абмен пярсцёнкамі). Існуе павер'е: чым багацейшыя прыбраныя шышкі, тым больш шчасліва будуць жыць маладыя.

Калі цеста выспела, каравайніцы пачыналі «круціць каравай» – услед за сонцам, па гадзіннікавай стрэлцы. Пасля садзіліся вырабляць разнастайныя фігуркі для ўпрыгожвання верху каравая: птушкі, крыжы. Па краі каравая клалі дзве паласы цеста ў выглядзе абруча (у маладой каравай упрыгожвала каса – сімвал дзявоцтва). Пасадзіўшы каравай у печ, старэйшая каравайніца тройчы біла ў столь драўлянай хлебнай лапатай (знак, звернуты да продкаў). Да каравая, пакуль ён пячэцца, звярталіся ў песнях-карацельках.

Каравай лічыцца асабліва ўдалым, калі прыходзіцца разбіваць печ, каб яго дастаць. Тады адна з каравайніц апранае кажух поўсцю ўверх, бярэ сякеру і пачынае сімвалічна сячы печ. Дастаўшы каравай, тры разы стукаюць ў столь так, каб хлебная лапата трэснула. Ставяць каравай на века ад дзяжы, пасыпанае жытам і пакрытае надзежнікам. Увесь час спяваюць песні, у якіх да каравая звяртаюцца як да жывой істоты. Калі каравай астываў, яго абгортвалі ручніком, і адначасова ўсе каравайніцы ўтыркалі ў яго шышкі. Вяроўкай з чырвоных нітак змацоўвалі па 4 і 5 шышак, пакінуўшы двайчатку (на караваі нявесты пакідаюць трайчатку). Гэтымі незмацаванымі шышкамі маладыя потым абменьваліся на вяселлі. Паміж шышкамі клалі невялікі бохан жытняга хлеба, а на яго – кусок сала.

Увесь час песнямі нібыта замаўлялі, малілі Бога даць шчаслівую долю маладым. Асабліва ўрачыстым быў момант вынасу каравая ў камору. Каравай выкупляў брат маладога, затым падымаў яго высока над галавой і тройчы круціўся па хаце «за сонцам», несучы ў камору. Вяртаючыся з каморы, удзельнікі зборнай суботы выконвалі песню-заклінанне, звернутую да Бога-продка. Дадзены вясельны абрад быў апісаны ў XIX ст. ураджэнкай суседняй з Мотылем вёскі і зафіксаваны беларускай фалькларысткай М. С. Моладавай.

Абрад «Ваджэнне і пахаванне стралы» захаваўся ў Беларусі ў аўтэнтычным выглядзе ў Веткаўскім раёне, яго рэпрэзентуюць супрацоўнікі Веткаўскага музея народнай творчасці. Аўтэнтычны абрад «Провады зімы» захоўваюць супрацоўнікі Пінкавіцкага літаратурна-краязнаўчага музея імя Якуба Коласа. Адметнасцю дадзеных абрадаў з'яўляецца тое, што яны захавалі сваю аўтэнтычнасць і праводзяцца на мясцовым матэрыяле, у тутэйшых строях. Зменлівасць нематэрыяльных аб'ектаў культуры непасрэдна звязана з іх працэсуальным характарам, паколькі, напрыклад, калі мы гаворым аб народным мастацтве, адначасова прытрымліваючыся норм традыцыі, адным з тыповых і асноўных

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

прыкмет усіх відаў народнага мастацтва з'яўляецца імправізацыя іх творцамі-выканаўцамі. Тое ж, як лічыць П. Г. Багатыроў, адносіцца і да з'яў «ненародных», такіх, як бытаванне прэцэндэнтных тэкстаў у сучаснай культуры, прафесіянальнага тэатра, музыкі [1, с. 7].

Дыскусійнай да сённяшняга часу застаецца праблема сутнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая з'яўляецца шматфункцыянальнай сістэмай і адлюстроўвае непарыўную сувязь эпох і пакаленняў. Шэраг навукоўцаў, у тым ліку і беларускіх, мяркуюць, што сутнасць нематэрыяльнай культурнай спадчыны складаюць *аб'екты,* створаныя папярэднімі пакаленнямі, якія маюць выключнае значэнне для культурнага генафонда нацыі і спрыяюць будучаму культурнаму прагрэсу [2]. Аб'екты нематэрыяльнай культурнай спадчыны з пункту гледжання музея ўмоўна можна падзяліць на 3 катэгорыі: увасобленыя ў фізічнай форме аспекты культуры і традыцыі пэўнай грамадскай супольнасці (абрады, традыцыйныя сямейна-родавыя святы, традыцыйнае светаўяўленне аб вядзенні гаспадаркі і асаблівасцях побыту); формы выяўлення, не ўвасобленыя ў фізічным стане (мова, традыцыйныя спевы, танец, гульні, мастацтва вуснай традыцыі – фальклор); знакава-сімвальнае, метафарычнае выяўленне аб'ектаў, якім надзелены матэрыяльныя аб'екты традыцыйнай беларускай культуры; знакі, сімвалы. Дарэчы, нягледзячы на тое, што на самой справе музеі Беларусі ўжо не першы год захоўваюць аб'екты традыцыйнай духоўнай культурнай спадчыны (асабліва тыя з іх, якія звязаны з фальклорам, вытворчымі працэсамі), увядзенне аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў музейную справу толькі пачынаецца.

У Міжнароднай канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны адзначаецца, што яе сутнасцю з'яўляюцца *элементы.* У сувязі з тым, што нематэрыяльная культурная спадчына як прадмет музейнай рэпрэзентацыі паступова набывае рысы важнага складніка сучаснай музейнай дзейнасці, актуальным з'яўляецца пытанне распрацоўкі як метадалогіі рэпрэзентацыі элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, (згодна з рэкамендацыяй ЮНЭСКА), так і адпаведных тэрмінаў, якія магчыма было б увесці ў навуковы катэгарыяльны апарат. Аднак, ні ў замежных краінах, дзе дадзенае паняцце атрымала найбольшае распаўсюджанне, ні ў нашай, пакуль не існуе агульнапрынятай трактоўкі.

На наш погляд, прадуктыўным ў выяўленні сутнасці паняццяў, якія тычацца нематэрыяльнай культурнай спадчыны, быў бы тэзарусны падыход, цэнтральным паняццем якога з'яўляецца тэзаурус. Шэраг даследчыкаў вызначае яго як «свядомасць» ці «памяць» [4]. Аднак філасофскія сэнсы, якімі поўніцца гэтая дэфініцыя, па



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нашым меркаванні, значна шырэйшыя і патрабуюць дэталёвага асэнсавання. Тэзаурусны падыход будуецца на ўсведамленні таго, што ў грамадстве ўплыў культуры азначае не менш, чым уплыў прыроды. Тэзаурусны падыход паказаў сваю эўрыстычнасць у культуралогіі, у межах якой фарміруецца тэзауралогія (суб'ектыўная культуралогія). Так, антычныя філосафы пад тэзаурусам (thésaurós) разумелі скарбніцу, багацце, запас. У навуковай тэрміналогіі нашага часу тэзаурус абазначае некаторым чынам асабліва аформленае назапашванне. У тэорыі штучнага інтэлекту ў разуменні тэорыі тэзауруса, акцэнт зроблены на сістэматызацыі дадзеных, якія складаюць тэзаурус. Зыходзячы з гэтага, магчыма даць наступнае азначэнне тэзауруса: структураванае ўяўленне і агульны вобраз той часткі сусветнай культуры, якую здольны засвоіць суб'ект. На аснове дадзенага азначэння магчыма меркаваць аб пабудове пэўнай структуры тэзауруса нематэрыяльнай культурнай спадчыны, у якой ядро тэзауруса складае традыцыя, яе ўспрыняцце суб'ектам. Яна займае ў свядомасці чалавека з традыцыйным светаўяўленнем пэўную нішу і прадстаўлена як некаторая паслядоўнасць структураваных сэнсаў. Менавіта такое ядро тэзауруса нематэрыяльнай культурнай спадчыны ляжыць у аснове канструявання рэчаіснасці чалавекам праз яго ўспрыманне і ўзаемадзеянне з навакольным светам.

У апошняе дзесяцігоддзе дэфініцыя «нематэрыяльная культурная спадчына» трывала ўвайшла ў нарматыўныя акты Міністэрства культуры і Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, у навукова-практычную дзейнасць шэрагу музеяў. Знікненне тысячагадовых традыцый, згасанне традыцыйных форм гаспадарання, забыццё традыцыйнай культуры розных народаў і этнасаў выклікала неабходнасць прыняцця з боку грамадскай супольнасці неадкладных мер па захаванні і трансляцыі аб'ектаў духоўнай спадчыны традыцыйнай (каранёвай) культуры Беларусі – культуры яе руральных (вясковых) суполак.

Аналіз дзейнасці музеяў Беларусі дае падставу сцвярджаць, што прыкладна толькі каля 20 % музеяў ад агульнай іх колькасці даволі грунтоўна займаюцца ў сваёй дзейнасці рэпрэзентацыяй нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Практычны вопыт Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, Музея старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Браслаўскага і Івянецкага музеяў традыцыйнай культуры, Музея традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я і іншых устаноў музейнага тыпу дазваляе вылучыць некалькі мадэлей рэпрэзентацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Даволі распаўсюджанай з’яўляецца мадэль «Жывое бытаванне». Такая метадалагічна абгрунтаваная форма працы з нематэрыяльнай спадчынай прадугледжвае захаванне і рэпрэзентацыю яе аб’ектаў праз разнастайныя інтэрактыўныя сродкі ўзаемадзеяння наведвальнікаў музеяў з непасрэднымі носьбітамі традыцыі. Пры выкарыстанні гэтай формы рэпрэзентацыі і паслядоўнай музеефікацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны музейным аб’ектам можа выступаць і носьбіт традыцыі. Узорам такой мадэлі з’яўляецца Недзяржаўны музейны комплекс старажытных народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі», які мае не толькі экспазіцыю і выставачную залу матэрыяльнай і нематэрыяльнай культуры, але і працуючыя кузню, ганчарню і рэстаўрацыйныя майстэрні, дрэваапрацоўчы цэх, пякарню, сыраварню, мукамольны цэх (вятрак), пчальнік, стайню, жывёлагадоўчую ферму, корчмы, невялікі заезны дом і славянскі бровар з арыгінальнымі хатнімі напіткамі. Да таго ж комплекс утрымлівае разнастайных хатніх жывёл і птушак. Наведвальнікаў музея вучаць ездзіць вярхом, запрагаць фаэтон, шарабан, сані-розвальні і інш.

Выкарыстоўваецца музеямі і мадэль «Музейная рэканструкцыя». Дадзеная форма прадугледжвае пабудову рэпрэзентацыі аб’ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны на аснове задакументаваных сведчанняў пра традыцыю. Яны, як правіла, валодаюць дастаткова высокай доляй інфармацыйнасці і адпавядаюць крытэрыю навуковай дакладнасці. Так, напрыклад, у рэпрэзентацыйную мадэль Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту ўбудаваны элементы рэканструкцыі ў спалучэнні з аўтэнтычнымі элементамі. На святах «Гуканняў вясны», «Масленіцы», «Юр’і», «Каляды» і інш. у БДМНАП навуковыя супрацоўнікі пераапранаюцца ў рэканструяваныя строі і ў рэканструяванай прасторы ўводзяць у святочнае дзейства наведвальнікаў. Аўтэнтычнымі ж элементамі ў мадэлі такой рэпрэзентацыі выступаюць фальклорныя гурты, якіх супрацоўнікі музея запрашаюць на святы.

Яшчэ адна мадэль «Музейнае мадэляванне» дазваляе супрацоўнікам музеяў эксперыментаваць у пошуку новых увасабленняў і аб’ектаў з мэтай трансляцыі, актуалізацыі традыцыйнай народнай культуры з выкарыстаннем элементаў як матэрыяльнай, так і нематэрыяльнай культуры. Мадэляванне ўяўляе сабой працэс аднаўлення аб’ектаў рэчаіснасці ў выглядзе імітацый, а канструяванне прадугледжвае выкарыстанне элементаў матэрыяльнай і духоўнай спадчыны для стварэння новых аб’ектаў на аснове распрацаванай музеямі канцэпцыі. У Докшыцкім, Браслаўскім, Гарадоцкім, Ушацкім, Шаркаўшчынскім дамах рамёстваў адноўлены старажыт-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя тэхналогіі абварной, чорназадымленай, паліванай керамікі. У Лепельскім, Гарадоцкім, Шумілінскім, Глыбоцкім, Браслаўскім дамах рамёстваў працуюць калектывы маладых ткачых, вядзецца сумесная з музеем навукова-даследчая праца па рэканструкцыі лакальных асаблівасцей народнага строю і народнага арнаменту, што зафіксавана ў навукова-фондавай дакументацыі музея і рэпрэзентуецца падчас канферэнцый і святаў, у якіх удзельнічае музей. Адноўлена больш за 20 відаў традыцыйных рамёстваў Беларусі. Дзеці і дарослыя ў музеі народнай творчасці пераймаюць ад народных майстроў традыцыі ткацтва, ганчарства, саломапляцення.

Такім чынам, цікавасць да праблемы нематэрыяльнай культурнай спадчыны звязана з актуальнымі задачамі як тэарэтычнага, так і практычнага характару.

## Літаратура


1. *Богатырев, П. Г.* Традиции и импровизации в народном творчестве / П. Г. Богатырев. М., 1964.
2. *Кананович, С. К.* К вопросу определения объектов наследия устной традиции в культурологии / С. К. Кананович // Вестник Института современных знаний. 2010. № 1. С. 79–82.
3. *Каулен, М. Е.* Нематериальные объекты наследия в современном музее / М. Е. Каулен // От краеведения к культурологии: Российскому институту культурологии 70 лет: сб. науч. статей / Рос. Ин-т культурологии; [редкол.: К. Э. Разлогов (отв. ред.) и др.]. М., 2002. С. 54–56.
4. *Луков, В. А.* Тезаурусный подход в гуманитарных науках / В. А. Луков // Знание. Понимание. Умение: фундаментальные и прикладные исследования в области гуманитарных наук. 2004. № 1. С. 93–100.
5. *Никишин, Н. А.* «Язык музея» как универсальная моделирующая система музейной деятельности / Н. А. Никишин // Проблемы культурной коммуникации в музейной деятельности : сб. науч. трудов. М., 1989. С. 43–47.
6. *Флиер, А. Я.* Культурология для культурологов : учеб. пособие / А. Я. Флиер. М., 2000.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ